www.Belarus-Live.eu

BELARUS Live

NEWSLETTER
14/03-21/03/08

**АФІЦЫЙНА**
▪Беларусь выказалася ў падтрымку Кітаю па тыбэцкім пытаньні

**ПАЛІТЫКА**
▪Улады Беларусі паскардзіліся на ЗША ў ААН

**ГРАМАДЗТВА**
▪Арганізацыя “Спадчына” ўзнагародзіла Аляксандра Казуліна ордэнам Кастуся Каліноўскага

**АПАЗЫЦЫЯ**
▪Сяргей Галаганюк пачаў галадоўку

**ЭКАНОМІКА**
▪Кампанія «iKobo» згарнула дзейнасьць у Беларусі

**КУЛЬТУРА**
▪Выстава ў гонар Юзэфа Крашэўскага

На мінулым тыдні працягвалася эскаляцыя беларуска-амэрыканскага дыпляматычнага канфлікту. 17 сакавіка ў МЗС Беларусі быў выкліканы Часовы паверан у справах ЗША ў Беларусі Джонатан Мур. Яму ў чарговы раз настойліва рэкамэндавалі скараціць колькасьць пэрсаналу амбасады ЗША ў Менску. Як вядома, 12 сакавіка, таксама пасьля настойлівых патрабаваньняў МЗС, зь Менску была вымушаная зьехаць амбасадарка ЗША Карэн Сьцюарт. Пасьля наведваньня Джонатанам Мурам беларускага МЗС зьявілася паведамленьне амбасады ЗША ў Менску. У ім гаворыцца, што ў цяперашні час урад ЗША разглядае рэкамэндацыю МЗС Беларусі наконт скарачэньня штату амбасады ЗША ў Менску. "У сувязі з гэтым разгляд візавых заяваў часова прыпынены, бо ў цяперашні час нашыя рэсурсы накіраваныя на іншыя прыярытэты", – зазначылі ў амбасадзе. І гэтае абмежаваньне закранула толькі беларускіх грамадзянаў.

Чарговае абвастрэньне адносінаў паміж Менскам і Вашынгтонам адбываецца на тле важных падзеяў, што адбыліся ў Брусэлі і Маскве. Намесьнік дзяржсакратара ЗША Дэвід Крэмэр і амбасадарка Карэн Сьцюарт правялі ў Брусэлі інтэнсіўныя кансультацыі з кіраўніцтвам Эўразьвязу і прадстаўнікамі дзяржаваў, якія ўваходзяць у ЭЗ . Ёсьць падставы сьцьвярджаць, што іх эўрапейскія суразмоўцы сур’ёзна паставіліся да абвастрэньня адносінаў паміж Беларусьсю і Злучанымі Штатамі і, безумоўна, падзяляюць занепакоенасьць ЗША паводзінамі беларускіх уладаў. Эўрапейцы пацьвердзілі, што пытаньне палітзьняволеных зьяўляецца прыярытэтным у адносінах зь Беларусьсю. Нейкія крокі насустрач беларускім уладам будуць магчымыя толькі пасьля вызваленьня ўсіх палітычных вязьняў.

Аднак апошняя вестка пра арышт у Менску грамадзяніна ЗША і ягонай супрацоўніцы, месцазнаходжаньне якіх да гэтага часу невядомае, можа толькі дадаць напружанасьці ў сытуацыі, што ўзьнікла. А паўторная адмова экс-кандыдату ў прэзыдэнты і палітзьняволенаму Аляксандру Казуліну ў зьмякчэньні пакараньня і зусім выклікала вялікія сумненьні ў наяўнасьці цьвярозага розуму ў беларускага кіраўніка.

Як раней паведамлялася, 13 сакавіка бягучага году дачка А. Казуліна Юлія накіравала просьбу наконт замены яе бацьку пакараньня на больш мяккае. Яна прасіла замяніць пазасталы тэрмін пакараньня на грамадзкія ці папраўчыя працы, а таксама перагледзець 10 парушэньняў рэжыму. У прыватнасьці, яна прасіла перагледзець парушэньні, зафіксаваныя падчас галадоўкі А. Казуліна.

"Адказ на заяву Ю. Казулінай, у якой яна просіць замяніць асуджанаму А. Казуліну пакараньне на больш мяккае, адпраўлены. Юліі Казулінай у пісьмовым выглядзе патлумачылі, што пытаньне пра замену А. Казуліну пакараньня на больш мяккае было разгледжанае ў вызначаны тэрмін, і яму адмоўлена ў зьмяненьні пакараньня", – паведамілі ў ВК "Віцьба-3".

Паводзіны Менску ў дачыненьні да Вашынгтону выглядаюць яўным дысанансам з камэнтарамі сусьветнай прэсы з нагоды перамоваў у Маскве дзяржсакратара ЗША Кандалізы Райс і кіраўніка Пэнтагону Робэрта Гейтса зь іх расейскімі калегамі ў фармаце "два плюс два", а таксама іх сустрэчы з прэзыдэнтам Уладзімерам Пуціным і новаабраным прэзыдэнтам Дзьмітрыем Мядзьведзевым. Перш за ўсё, амаль аднадушна адзначаецца іх прымірэнчая танальнасьць. Нічога падобнага не назіраецца ў беларускага стратэгічнага хаўрусьніка Масквы, зь якім зусім нядаўна ў Менску была падпісаная праграма каардынацыі замежнай палітыкі дзьвюх дзяржаваў. Назіральнікі адзначаюць зьнешне нэўтральную і маўклівую пазыцыю Крамля ў адносінах да беларуска-амэрыканскага канфлікту.

Лягічным працягам нагнятаньня напружанасьці можна лічыць нядаўнюю нараду сілавых ведамстваў.

"Дзяржсакратарыят Рады Бясьпекі павінен ня толькі кантраляваць, але і максымальна падвысіць попыт, узварушыць усю сілавую і праваахоўную сыстэму, значна яе ўдасканаліць і прывесьці ў адпаведнасьць з патрабаваньнямі сёньняшняга дня. Не камандаваць, а каардынаваць правядзеньне палітыкі прэзыдэнта ў гэтых галінах", — сказаў А. Лукашэнка падчас нарады з прадстаўнікамі сілавых ведамстваў.

Ён таксама зазначыў, што «насьпела неабходнасьць удасканаленьня нормаў крымінальнага і крымінальна-працэсуальнага заканадаўства, у тым ліку сыстэмы мераў крымінальнай адказнасьці». А. Лукашэнка паабяцаў усьлед за сілавым «узрушыць» і эканамічны блёк улады, то бок урад.

Не засталася без увагі Лукашэнкі і сытуацыя ў сьвеце. «У бліжэйшы час мы можам аказацца ў новай, больш напружанай абстаноўцы ў сьвеце і вакол Беларусі, што патрабуе адэкватнага рэагаваньня з улікам нашых нацыянальных інтарэсаў і бясьпекі нашай дзяржавы і нашага народу», — сказаў беларускі кіраўнік.

«Фактычна вырашанае пытаньне пра разьмяшчэньне паблізу нашых межаў элемэнтаў амэрыканскай сыстэмы супрацьракетнай абароны, што падрывае стратэгічную стабільнасьць», — падкрэсьліў Аляксандар Лукашэнка. Ён нагадаў прысутным на нарадзе, што нядаўна Расея, адчуўшы нарастаньне зьнешняй пагрозы, набліжэньне рэальнай небясьпекі да сваіх межаў, афіцыйна прыпыніла ўдзел у Дамове аб звычайных узброеных сілах у Эўропе. Неадназначная сытуацыя, паводле ягоных словаў, складаецца вакол Дамовы аб ліквідацыі ракетаў сярэдняй і меншай далёкасьці.

Некаторыя назіральнікі прагназуюць узмацненьне рэпрэсіяў і хвалю кадравых чыстак у Беларусі, прадвесьнікам якіх і стала дадзеная нарада. Падобна, Лукашэнка здольны ўтрымліваць сваю ўладу толькі пры дапамозе напружаньня, якое ён пэрыядычна ставарае ў замежнай і ўнутранай палітыцы.

Значнай падзеяй можа стаць і грамадзянская кампанія «Беларусь – у Эўропу!». Яе актывісты перадалі кіраўніку Офісу АБСЭ ў Менску Хансу-Ёхану Шміту заяву з прапановай кіраўніцтву АБСЭ і МЗС Беларусі правесьці публічныя слуханьні пра выкананьне Беларусьсю сваіх абавязкаў, зьвязаных з членствам у гэтай арганізацыі.

Неабходнасьць правядзеньня слуханьняў зьвязаная з тым, што прадстаўнікі дзяржаўных органаў Беларусі пастаянна ўздымаюць тэму парушэньня асноватворных дакумэнтаў АБСЭ з боку некаторых іншых дзяржаваў — чальцоў дадзенай арганізацыі.

У той жа час, лічаць актывісты гэтай грамадзянскай ініцыятывы, маюцца сур'ёзныя нагоды думаць, што ўрад Беларусі далёка ня ў поўнай меры садзейнічае выкананьню ўзятых на сябе абавязацельстваў. У прыватнасьці, беларускі ўрад не аднойчы быў раскрытыкаваны кампэтэнтнымі міжнароднымі і нацыянальнымі арганізацыямі за свае дзеяньні, якія прама разыходзяцца з такімі асноватворнымі прынцыпамі АБСЭ, як павага правоў чалавека і асноўных свабодаў, дэмакратыя і вяршэнства закону, за невыкананьне многіх іншых стандартаў чалавечага вымярэньня.

Пры дапамозе публічных слуханьняў пад эгідай Офісу АБСЭ ў Менску, лічаць каардынатары грамадзянскай кампаніі, можна прадставіць увесь спэктар існуючых поглядаў на абавязацельствы, што накладаюцца на любую дзяржаву пры ўступленьні ў АБСЭ, а таксама на ступень выкананьня гэтых абавязацельстваў з боку Беларусі.

Прапанаваныя публічныя слуханьні павінны прайсьці не пазьней за травень гэтага году. Ініцыятары завяраюць, што слуханьні пройдуць у любым выпадку.

Заява пра правядзеньне публічных слуханьняў 19 сакавіка была накіраваная і ў МЗС Беларусі.

---

## АФІЦЫЙНА

### Беларусь выказалася ў падтрымку Кітаю па тыбэцкім пытаньні

**«Беларускі бок нязьменна разглядае Тыбэт у якасьці неад'емнай часткі Кітаю й пацьвярджае сваю падтрымку мераў кіраўніцтва КНР, якія накіраваны на забясьпячэньне сувэрэнітэту й тэрытарыяльнай цэласнасьці краіны», – гаворыцца ў заяве Міністэрства замежных справаў Беларусі, якую агучыў прэс-сакратар замежнапалітычнага ведамства Андрэй Папоў.**

«Беларускі бок упэўнены, што цяперашнія супрацьпраўныя дзеяньні ў аўтаномным рэгіёне будуць бліжэйшым часам спыненыя, і жыцьцё ягонага насельніцтва вернецца ў нармальнае рэчышча», — зазначаецца ў прэс-рэлізе.

Як паведамлялася, у выніку беспарадкаў у Тыбэце й сутыкненьняў пратэстуючых з паліцыяй загінула каля 100 чалавек – гэта неафіцыйныя дадзеныя. У сваю чаргу Пэкін паведамляе пра 13 загінулых.

## ПАЛІТЫКА

### Улады Беларусі паскардзіліся на ЗША ў ААН

**Рэспубліка Беларусь паінфармавала генэральнага сакратара ААН Пан Гі Муна пра ўведзеныя ЗША дадатковыя эканамічныя санкцыі супраць канцэрну "Белнафтахім".**

Пастаяннае прадстаўніцтва пры ААН накіравала на імя кіраўніка сакратарыяту ААН ліст з просьбай апублікаваць адпаведную заяву Міністэрства замежных справаў Беларусі ад 7 сакавіка ў якасьці афіцыйнага дакумэнту Генэральнай асамблеі ААН.

У дакумэнце зазначаецца, што, падпісаўшы Хельсынскі заключны акт, ЗША, як і іншыя краіны-ўдзельніцы АБСЭ, узялі на сябе абавязак "у любых сытуацыях ўстрымліватца ад любога акту эканамічнага прымусу, накіраванага на падпарадкаваньне сваім уласным

інтарэсам выкананьня іншай дзяржавай-удзельніцай правоў, якія зьўляюцца часткай яе сувэрэнітэту”.

На думку кіраўніцтва Беларусі, апошнія крокі адміністрацыі ЗША адносна Беларусі супярэчаць падпісанаму пагадненьню й кідаюць выклік усім чальцам АБСЭ.

## ГРАМАДЗТВА

### Арганізацыя “Спадчына” ўзнагародзіла Аляксандра Казуліна ордэнам Кастуся Каліноўскага

**Першым ордэнам быў адзначаны лідэр “Маладога Фронту” Зьміцер Дашкевіч.**

У сувязі з 90-годзьдзем БНР прынятае рашэньне пра ўзнагароджаньне рознымі ўзнагародамі шэрагу вядомых асобаў. Напрыклад, сярод адзначаных – Хведар Нюнька, дзеяч Саюзу беларусаў Летувы, Вольга Казуліна – дачка палітвязьня, каардынатар “Хартыі’97” Андрэй Саньнікаў, пісьменьнік Алесь Пашкевіч і іншыя асобы.

## АПАЗЫЦЫЯ

### Сяргей Галаганюк пачаў галадоўку

**Грамадзкі актывіст Сяргей Галаганюк далучыўся да галадоўкі братоў Скрабцоў. Такім чынам, ужо тры асобы галадаюць, патрабуючы вызваленьня Аляксандра Казуліна.**

Яны, аднак, упэўненыя, што праз некалькі дзён іх будзе каля 10 чалавек.

Галадоўнікі адчуваюць сябе добра. Актывісты папярэджваюць, што калі яны пачнуць адчуваць сябе не найлепшым чынам, то перабяруцца ў адну кватэру, дзе будуць знаходзіцца да канца.

## ЭКАНОМІКА

### Кампанія «iKobo» згарнула дзейнасьць у Беларусі

**Амэрыканская фінансавая кампанія «iKobo Inc.» абвясьціла, што спыняе абслугоўваньне кліентаў, якія жывуць ці знаходзяцца на тэрыторыі Беларусі.**

На сайце кампаніі «iKobo» (https://ru.ikobo.com/enru/country_pages.html) Беларусь больш не фігуруе ў сьпісе краінаў, дзе абслугоўваюцца яе карткі. Уладальнікі картак «iKobo Visa» атрымалі паведамленьні, што кампанія больш ня можа аказваць ім паслугі ў зьвязку з абмежаваньнямі ўраду ЗША адносна Беларусі. Кліентам, якія маюць карткі, прапанавана зьняць грошы цягам пяці дзён. Дырэктар кампаніі “Інтэр-Сміт” Аляксандар Нікалайчук мяркуе, што нязручнасьці могуць тычыцца каля трох тысячаў карыстальнікаў картак «iKobo» ў Беларусі, пераважна праграмістаў, якія працавалі па аўтсорсінгу на заходнія кампаніі.

*Svaboda.org*

## КУЛЬТУРА

### Выстава ў гонар Юзэфа Крашэўскага

**У Берасьці ў музэі “Выратаваныя каштоўнасьці” распачала сваю працу выстава, прысьвечаная Юзэфу Ігнацы Крашэўскаму, вядомаму пісьменьніку, публіцысту, выдаўцу, этнографу й архэолягу XIX стагодзьдзя. Пра гэта паведамляе карэспандэнт Польскага радыё ў Берасьці.**

Юзэф Крашэўскі паходзіць зь сям’і пружанскага харужага й сваё дзяцінства правёў у вёсцы Доўгае каля Пружанаў. Ягонае жыцьцё зьвязанае як з палітычнай дзейнасьцю, так і літаратурнай. Ён быў удзельнікам антыцарскай змовы 1830–32 гадоў, за што трапіў у астрог, а пасьля падаўленьня паўстаньня 1863–64 гадоў да

канца жыцьця знаходзіўся ў эміграцыі. Юзэф Крашэўскі – аўтар 223 раманаў і аповесьцяў, занесены ў Кнігу рэкордаў Гінэса як адзін з самых пладавітых пісьменьнікаў у сьвеце. У сваіх творах знаёміць чытачоў з жыцьцём і культурай беларускага, польскага і ўкраінскага народаў. Ён пакінуў цікавыя нарысы аб берасьцейскім рэгіёне, пісаў пра Пінск, Берасьце, Кобрын і Пружаны. Ён таксама зьяўляецца стваральнікам польскага рэалістычнага гістарычнага раману.

У экспазыцыі берасьцейскага музэю прадстаўленыя партрэты й некаторыя ягоныя творы. Экспанаты паведамляюць пра ягоныя падарожжы ў Вільню, Жытомір, Варшаву й Дрэздэн, а таксама пра вандроўкі па Валыні. Дарэчы, адным з арганізатараў выставы зьяўляецца калектыў супрацоўнікаў музэя-сядзібы "Пружанскі палацык".

---

Існуе шмат сайтаў, прысьвечаных падзеям у Беларусі, аднак яны малавядомыя ў Заходняй Эўропе, асабліва тым, хто займаецца фармаваньнем палітыкі адносна Беларусі й ня ведае беларускай ды расейскай моваў.

Сэрвіс belarus-live запаўняе гэты прагал. Штотыднёвую рассылку на ангельскай, польскай, беларускай ды расейскай мовах можна замовіць на сайце.